УДК 323.2:008-028.78(=161.3)

*В. А. Максімовіч*

# Нацыянальная мастацкая традыцыя як аснова захавання гуманітарнай бяспекі грамадства

*Асэнсоўваецца роля нацыянальнай мастацкай традыцыі ў культуралагічным і філасофскім аспектах. Раскрываецца анталагічная сутнасць традыцыі як асновы нацыянальнага архетыпа. Разглядаецца сувязь традыцыйнай культуры з гуманітарнай бяспекай грамадства. Падкрэслена ўздзеянне эстэтычных, этычных і маральных каштоўнасцей беларускай этнічнай культуры на фарміраванне сацыякультурных норм грамадства.*

Нацыянальная мастацкая традыцыя выступае адным з найважнейшых кампанентаў нацыянальнай бяспекі ў гуманітарнай сферы. *Гуманітарная бяспека* – гэта стан грамадскіх адносін унутры краіны і на міжнароднай арэне, які гарантуе абароненасць мэт, ідэалаў, каштоўнасцей і традыцый, ладу жыцця і культуры чалавека, сям'і, народа і забяспечвае іх стабільную жыццядзейнасць, устойлівае функцыянаванне і развіццё правоў і абавязкаў, асноўных свабод для ўсіх без выключэння грамадзян незалежна ад іх этнічнай прыналежнасці, мовы і рэлігіі. Іншымі словамі, сутнасць гуманітарнай бяспекі заключаецца ў абароненасці традыцыйнай культуры, веры, адукацыі, духоўнасці, маральнасці, а таксама ў забеспячэнні свабод і правоў кожнай асобы (з улікам канкрэтных абавязкаў грамадзяніна). Гуманітарная бяспека звязана з захаваннем на адпаведным узроўні жыццядзейнасці грамадства з улікам папярэджання рэальных і патэнцыяльных пагроз, што зыходзяць ад праблем і супярэчнасцей духоўна-маральнага стану грамадства, крытычнага стаўлення да сутнасці патрыятызму, асабліва сярод моладзі, адсутнасці дакладна сфармуляванай і адэкватна ўспрымальнай рознымі сацыяльнымі пластамі (групамі, грамадскімі, палітычнымі структурамі і г. д.) нацыянальнай ідэі.

Гуманітарная бяспека звязваецца найперш з абаронай жыццёва важных інтарэсаў асобы, грамадства, краіны, чалавецтва ў цэлым ад унутраных і знешніх пагроз. Яна трымаецца на прынцыпах гуманізму, адстойвання імператыву годнасці асобы, яе права на ўдзел у розных сферах жыццядзейнасці грамадства, магчымасці доступу да каштоўнасцей нацыянальнай культуры, на самарэалізацыю ў межах этнічнай культуры.

Найважнейшай складальнай часткай гуманітарнай бяспекі з'яўляецца права на культуру, магчымасць удзельнічаць у захаванні, развіцці і памнажэнні нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей шляхам рэалізацыі творчага патэнцыялу. Канцэптуальная стратэгічная актуальнасць і запатрабаванасць дадзенага кампанента прадыктавана

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходнасцю адстойвання права на захаванне этнічнай культуры, сацыяльнага, моўнага, каштоўнасна-сэнсавага, геаграфічнага асяроддзя пражывання грамадства, дзяржаўнага суверэнітэту, нацыянальных самавызначэння і бяспекі ўвогуле.

У кантэксце нацыянальнай бяспекі краіны ў гуманітарнай сферы важным кампанентам выступае духоўна-маральная бяспека. У Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2010) падкрэсліваецца, што грамадства мае звышпільную патрэбу ў ідэалах і маральных каштоўнасцях, у пад'ёме планкі духоўнай культуры. Дзяржава і грамадства павінны сумеснымі намаганнямі ствараць рэальныя ўмовы для свабоднай творчай дзейнасці, удзяляць увагу фарміраванню цэласнай комплекснай культурнай і мастацка-эстэтычнай адукацыі, метадам і прыёмам выхавання, прыкласці намаганні дзеля захавання і памнажэння маральных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа, нацыянальных культурных традыцый.

У гэтай сувязі В. А. Паўлоўская адзначае, «што ў будучым інфармацыйным грамадстве павінна значна вырасці роля духоўна-маральных каштоўнасцей як жыццёва неабходных атрыбутаў чалавечага быцця. У адваротным выпадку чалавека чакае даволі непрывабны лёс: прамая залежнасць ад створанай ім тэхнікі, дзе ён будзе звычайным выканаўцам, функцыянерам, абслугоўваючым персаналам, у рэшце рэшт ператворыцца ў адну з так званых разумных рэчаў» [4, с. 15]. Аўтар слушна гаворыць пра неабходнасць ачалавечвання чалавека, пра пераадоленне ім адчужанасці і самадчужанасці праз пашырэнне і паглыбленне працэсаў прысваення і самапрысваення дасягненняў матэрыяльнай і духоўнай культуры, ператварэння іх у асабістую культуру, творчае, свабоднае, адказнае развіццё сваёй прыроды, абагачэнне ўнутранага свету, чалавечых пачуццяў, удасканаленне адносін з людзьмі, акаляючым светам [Там жа, с. 16]. Дастаткова ўсвядомленае, рацыянальнае пазіцыянаванне сябе ў якасці паўнавартаснага суб'екта, здольнага рабіць выбар, фармуляваць уяўленне пра свет і сябе ў гэтым свеце, адкрывае шлях да ўзважанага падыходу ў вызначэнні ўласных светапоглядных, каштоўнасна-сэнсавых прыярытэтаў і патрэб, прынятых у якасці матывацыйных рэгулятараў жыццядзейнасці, што вызначаюць стратэгічную накіраванасць на фарміраванне сацыякультурных норм.

Надзвычай дзейсным сродкам у сістэме гуманітарнай бяспекі з'яўляюцца нацыянальныя каштоўнасці, захавальнікам і рэтранслятарам якіх справядліва лічыцца нацыянальная культура і, у прыватнасці, літаратура. У культуры і мастацтве па-свойму кандэнсуецца гістарычны і духоўны вопыт многіх пакаленняў, замацоўваюцца і транслююцца спрадвечныя сакральныя архетыпы, міфалагемы, сімвалы, вобразы, у якіх утрымліваюцца сталыя, замацаваныя традыцыяй коды культуратворчасці, дзякуючы чаму захоўваецца і ўзнаўляецца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальная жыццестваральная стратэгія. Больш за тое, кожная асобна ўзятая традыцыя выступае ў ролі носьбіта канкрэтнага нацыяўтваральнага кода ці нарматыўна-інстытуцыянальнага рэгістра агульнапрынятых сістэмаўтваральных каштоўнасцей, у адпаведнасці з якімі ажыццяўляецца духоўная сувязь паміж многімі пакаленнямі людзей. Менавіта спасціжэнне базавых семіётыка-семантычных структур дазваляе прадстаўніку пэўнага этнасу засвоіць «прамову» (старажытную мову-аснову), «ген», першаэлемент гістарычнай і культурнай традыцыі. Пэўная канфігурацыя каштоўнасцей культуры складае яе базіснае ядро, генатып, якім абумоўлены ўнутрысацыяльныя сувязі і міжасабовыя кантакты. У дачыненні да сфер мастацтва засяродзім увагу на нацыянальным акцэнце, што «ўяўляе сабою гістарычна абумоўленую характэрнасць, <…> адметныя рысы мастацкага генія пэўнага народа, якія ўдзельнічаюць у фарміраванні стылю і працягваюць істотна ўплываць на яго далейшае развіццё… Нацыянальны акцэнт можа быць арыенцірам і для эвалюцыі літаратуры, і для фарміравання нацыянальнага характару, і ў палітычна-ідэалагічнай сферы» [3, с. 257].

Нацыянальная мастацкая традыцыя выступае ў якасці каштоўнасна-нарматыўнай асновы развіцця грамадства, своеасаблівай антрапалагічнай матрыцы, у якой сфакусіраваны дзейсныя механізмы, «кодэксы», што спрыяюць захаванню духоўна-маральных якасцей чалавека, яго ідэнтычнасці, вызначаюць светапоглядныя і метадалагічныя рэгулятывы ўстойлівага сацыякультурнага развіцця. Яна з'яўляецца важнай інтэгральнай часткай культурнай традыцыі, якая замацоўвае, акумулюе і трансліруе матэрыяльныя, сацыяльныя і духоўныя каштоўнасці, створаныя чалавекам на працягу доўгага гістарычнага перыяду. У мастацкай літаратуры гэтыя каштоўнасці выяўляюцца праз максімальна абагульнены жыццёвы вопыт пісьменніка, мастацка-вобразную сістэму яго твораў. Як адзначае Т. І. Шамякіна, «культурная, духоўная сутнасць літаратуры ў тым, што яна – адзіная з'ява культуры, у якой чалавек увасабляе сябе цэласна, у паўнаце сваіх перажыванняў, роздумаў, мар» [5, с. 5]. Л. М. Уладыкоўская слушна заўважае, што «культура без традыцыі не існуе, бо абапіраецца на гістарычную памяць і калектыўны вопыт, на самую культурную спадчыну і разуменне неабходнасці яе захавання, на пераемнасць як дыялектычную аснову любога развіцця. Культурная традыцыя трымаецца на выпрацаваных і правераных пакаленнямі сацыяльных нормах і ўстаноўках, культурных узорах, якія абумоўліваюць існаванне "ядра", "фундамента" грамадства, а таксама вызначаюць тэндэнцыю да выпрацоўкі нейкай агульнай праграмы жыццядзейнасці, адзіных прынцыпаў існавання, якія ствараюць пэўную індывідуальна-нацыянальную панараму быцця» [1, с. 189]. Акрамя таго, культурная традыцыя выступае пэўным ацэнкавым камертонам у адносінах да сацыяльных інстытутаў, грамадскіх рухаў і ініцыятыў і акрэслівае



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кірунак і характар для іншых сфер сацыякультурнай жыццядзейнасці. Менавіта культурная традыцыя служыць функцыянальнай асновай шматпланавага ўзаемадзеяння розных грамадстваў, яна пранізвае ўсе ўзроўні грамадска-палітычнага жыцця, актыўна дзейнічае не толькі на міжнародным, дзяржаўным, нацыянальным, сацыяльна-класавым узроўнях, але і на індывідуальна-асобасным [Там жа, с. 189–190].

Дзякуючы гістарычнай пераемнасці традыцый перад літаратурай адкрываюцца неабмежаваныя магчымасці для ідэйна-канцэптуальнага выражэння нацыянальнага светабыцця, распазнавання «генетычнай матрыцы мыслення». Менавіта традыцыя ў яе анталагічнай сутнасці склала аснову нацыянальнага архетыпа – спецыфічнага сродку праяўлення нацыянальнай рэцэпцыі, пэўных адносін, норм, прынцыпаў маралі, якія служылі ўмовай і сродкам канкрэтызацыі маральна-этычнага імператыва, спасціжэння законаў чалавечай супольнасці, а разам з тым універсальных законаў быцця. Гэта той самы выпадак, калі літаратура, кіруемая высакароднай патрыятычнай ідэяй, бярэ на сябе задачу фарміравання нацыянальнага тыпу светабачання і светаразумення, грунтуючыся пры гэтым на пэўнай сістэме светапоглядных уяўленняў.

Яскравым прыкладам плённага развіцця і ўзбагачэння нацыянальнай традыцыі з'яўляецца творчасць Я. Купалы і Я. Коласа. Прыярытэтнае месца пры ўсёй шматвектарнасці іх эстэтычных пошукаў займалі традыцыйныя каштоўнасці, спадчына мінулага, што спакваля ўступалі ў дыялог з найноўшымі дасягненнямі сусветнай філасофска-рэфлексіўнай думкі, працэсамі агульначалавечай цывілізацыі. Творчасць класікаў з'яўляецца прыкладам арганічнага спалучэння наватарства і павагі да мінулага. У культурнай традыцыі захоўваюцца вытокі інтэнсіўнага калектыўнага светаадчування, кансалідуючай свядомасці народа.

У суровых віхурах часу Купала і Колас шукалі шляхоў паяднанасці, духоўнага кантакту з народам дзеля ўсталявання – як канчатковай мэты – нацыянальнай дзяржаўнай супольнасці. Надзвычай важным уяўлялася з дапамогай мастацкага слова ўзварухнуць, абудзіць гістарычна прыспаную свядомасць народа з тым, каб наладзіць духоўны дыялагічны кантакт, заклікаць да суразмоўя, супольнага супрацьстаяння жыццёвым злыбедам, да пошукаў шляхоў у будучыню. Выпрацоўка стрыжнёвага нацыянальнага ідэалу стала злабадзённым патрабаваннем часу і аб'ектыўнай гістарычнай заканамернасцю. Толькі супольнымі намаганнямі пры ўмове кансалідацыі ўсяго грамадства ўяўлялася магчымым дасягненне мэты.

Курс на абнаўленне і абуджэнне духоўных і творчых сіл чалавека і нацыі ў пачатку XX ст. быў гістарычнай неабходнасцю і адной з рэальных перадумоў паспяховага і паўнацэннага выканання літаратурай грамадскай функцыі. У культурнай свядомасці эпохі нацыянальнага адраджэння пад уплывам новых прыярытэтаў складвалася культуралагічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праграма дзеянняў, дзе пануючае становішча заняла субстратная ідэя прапаганды народнай культуры, шанавання мовы, развіцця ўласных нацыянальных форм. Дзякуючы гістарычнай пераемнасці, трансляцыі традыцыі перад літаратурай адкрываліся неабмежаваныя магчымасці для ідэйна-канцэптуальнага выражэння нацыянальнага светабыцця.

Высокамастацкія артэфакты паступова траплялі ў разрад канцэптазначных, эталонных нацыянальна-культурных знакавых кодаў, якія фарміруюць светапогляд людзей, набываючы сталае культурна-гістарычнае значэнне і ментальную ўстойлівасць сярод носьбітаў пэўнай культурнай прасторы. Зараз можна сцвярджаць, што яны ўпісаны ў сістэму беларускай культуры, выступаюць у якасці інтэгральнай часткі аб'яднальнага сімвалічнага ўніверсуму, маюць ярка выяўленую нацыянальную маркіраванасць, заключаюць у сабе значэнні і сэнсы, суаднесеныя ў рознай ступені з сацыяльна дзейснай інтэнцыяльнасцю.

Па сваёй унутранай семантыка-semiятычнай ангажаванасці да падобных канцэптуальных сэнсавых структур прымыкаюць, напрыклад, творы класікаў беларускай літаратуры: паэмы Я. Коласа «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях»; зборнікі Я. Купалы «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця», паэмы «Бандароўна», «Магіла льва», «Курган», «Адвечная песня», «Сон на кургане»; кніга вершаў М. Багдановіча «Вянок», назвы асобных цыклаў кнігі («У зачарованым царстве», «Думы», «Каханне і смерць») і інш. Яны складаюць значны кантэкст нацыянальнага мастацтва, аднесены да разраду феноменаў, якія ўплываюць на фарміраванне нацыянальнага культурнага асяроддзя. Канцэптуальная запраграмаванасць гэтых літаратурных шэдэўраў дае магчымасць інтэрпрэтаваць і спасцігаць нацыянальную гісторыю, яе высокі філасофскі сэнс, адчуваць сваю спрычыненасць да вечных культурных каштоўнасцей, да нятленнага скарбу нацыі.

Усведамленне духоўнай далучанасці да нацыянальна значных культурных артэфактаў адкрывае магчымасць прадстаўніку кожнай этнакультурнай супольнасці ідэнтыфікаваць сябе ў якасці суб'екта асаблівага гісторыка-фенаменалагічнага асяроддзя, спасцігаць сэнсы і каштоўнасці, значныя для яго, што ў выніку дазваляе істотна пашырыць і ўзбагаціць унутраны свет.

Увасобленым прыкладам паспяховага фарміравання нацыянальнай мастацкай традыцыі можа служыць спадчына класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча, якая стала неад'емным атрыбутам нацыянальнага культурнага кантэксту.

Асноўным творчым прынцыпам М. Багдановіча было імкненне да ўніверсалізму, касмапалітызму («космасу культур»), свабоднага прыцягнення ў арбіту сваёй культуратворчасці ўсіх магчымых архетыпічных кодаў, знакаў і канцэптаў сусветнай культуры. Складаная і разгалінаваная



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сістэма асацыятыўных сувязей і запазычанняў вядзе да ўніверсалізацыі кожнага ладу і матыву і ператварае паэзію Багдановіча ў свайго роду анталогію чалавечай гісторыі і культуры.

М. Багдановіч не займаўся свядомай дэканструкцыяй чужой культурнай традыцыі, а стараўся «прышчапіць» яе да ўласнай культурнай мадэлі. Мэтай творцы было захаваць і перадаць аўтэнтыку, першапачаткова зададзены сэнс прыцягнутага ў абсягі нацыянальнага культурнага канона высокагатунковага мастацкага матэрыялу. Падобнае «прышчапленне», гаворачы постмадэрнісцкай мовай, ні ў якім разе не выступае ў якасці агента мутацыі традыцыі, задача якога – памнажаць, пладзіць падманныя сімулякры-заменнікі. Наадварот, само прыцягненне ў арбіту субстратнай, аўтахтоннай культуры «статыкі» і «дынамікі» чужой традыцыі магчыма толькі пры захаванні суб'ектыўных і аб'ектыўных фактараў. З суб'ектыўнымі фактарамі звязаны момант «выбару аўтарытэтаў», наяўнасць духоўнага сугучча жыццёвага і творчага вопыту, падобных ці блізкіх мастацкіх і светапоглядных прыярытэтаў. Варта браць пад увагу і спецыфіку дзейсна-гістарычнай свядомасці і культурнай прыналежнасці суб'екта як асобы і носьбіта пэўнай культурнай ідэнтычнасці.

Немалаважнае значэнне мае і фактар аб'ектыўны – жаданне ўпісаць сваю традыцыю ў шырокае поле сусветнай культуратваральнай дзейнасці, засведчыць факт культурнай пераемнасці. Вось чаму зборнік М. Багдановіча «Вянок» нагадвае векапомны Акропаль культуры, які непамерна пашырае сэнсавы гарызонт кнігі. Гэтаму спрыяюць розныя сродкі і прыёмы – ад манеры спавядальнасці лірычнага героя да вар'іравання тэматычных структураўтваральных блокаў і жанравага дыяпазону, руплівай шліфоўкі кожнага сэнсарада, давядзення думкі да лагічнага завяршэння, успрымання літаратурнага твора як эстэтычнага феномена. У выніку дасягаецца зайздросны эфект не проста дэманстрацыі (акумуляцыі) прыгажосці абраных паэтычных форм і жанраў (санет, трыялет, рандо, верлібр, белы верш, танка, хоку і г. д.), а іх наўмысная акумуляцыя, «музеізацыя», «гербарызацыя», а значыць – увекавечанне з мэтай наступнага перманентнага паўтарэння-вяртання ў вечным кругабегу (лац. crugobeg – перыяд) вершатворчасці і жыццятворчасці.

Паэт творыць як бы па законах іканапіснай традыцыі, у якой няма нічога выпадковага, і кожны вобраз, і нават драбнюткія дэталі яго заключаюць у сабе пэўны сімвалічны сэнс. Вось чаму для яго такое істотнае значэнне мае ідэя сінтэзу, аб'яднальнай арганічнай сувязі пазнавальнага ўніверсуму культуры, які для паэта існуе рэальна. Можна меркаваць, што М. Багдановіч ставіў сабе звышзадачу стварыць *саборны паэтычны канон розных культур і цывілізацый*, які б спалучыў і прымірыў у сабе гэтыя культуры. Як і П. Фларэнскі, М. Багдановіч шукаў адпаведнасці, якая



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магла б указаць на адзіны «каранёвы» пачатак станаўлення сусветнай духоўнай культуры. Тым самым ён падкрэсліваў ідэю духоўнага адзінства чалавечых культур і сакральных гісторыка-культурных сімвалаў, застылых у кананічных формах. Вобразна-сімвалічнымі сродкамі, шляхам трансляцыі мастацкага канона Багдановіч як бы спрабаваў вывесці *цэласную паэтычную тыпалогію духоўнасці, радаслоўную ўсёй чалавечай культуры*. Вось чаму і ў кнізе «Вянок», дзе так моцна выяўлены кананічны пачатак, выразна праступае жаданне паэта стварыць паэтычны «канон канонаў», што здолеў бы заключыць у сабе тэзаўрус усёй культуры і замкнуць на сабе ўвесь яе сэнс, здольны бясконца ўзбагачацца новымі трактаваннямі. Інтэрпрэтацыйныя стратэгіі служаць неабходнай умовай пастаяннага сэнсавага абагачэння культурнай рэальнасці, адным са шляхоў яе напаўнення новым зместам экзістэнцыяльнага вопыту.

Разам з тым нельга не адзначыць той факт, што паступова пачынае складвацца якасна новае стаўленне чалавека да культурных базавых праграм – асэнсаванае, рацыяналізаванае, якое прайшло праз прызму крытычнага аналізу і праектнага мыслення. Пад уплывам працэсу мадэрнізацыі сістэм адносін грамадства і сацыяльных мікрасістэм, гнуткага тыпу ўзаемасувязі суб'екта і культуры адбываецца «перагрупоўка» традыцыйных матрыц. У першую чаргу гэта звязана са спробай выбудаваць рэйтынгавую шкалу прыярытэтаў, якая напрамую залежыць ад падзей, змен, сувязей і ідэалагічных, палітычных, эканамічных, сацыяльных адносін, што адбываюцца ў грамадстве. Сацыяльна гамагенны свет выразна распадаецца на розныя прафесіі, грамадскія групы, субкультуры, што ў сваю чаргу прадуцыруе новыя суадносіны ўзаемадзеяння чалавека і традыцыі. Гэта выяўляецца ў імкненні чалавека да духоўнасці, сапраўднасці быцця, у карэляцыі дзеянняў, перажыванняў, думак, паводзін з сацыякультурнымі ўзорамі. Выбар, як правіла, абумоўлены ў многім тым, у якой паслядоўнасці з улікам ступені важнасці, запатрабаванасці будуць успрымацца крытычна думаючым рэцыпіентам базісныя семантычныя пласты: адны з іх стануць глыбіннымі (якія ўтвараюць ментальны ўзровень свядомасці), іншыя апынуцца на паверхні сэнсу.

Гаворка ідзе аб свядомым выбудоўванні каштоўнасна-сэнсавай іерархіі гэтых пластоў. Унутраная архітэктоніка, або каштоўнасна-сэнсавая канфігурацыя ўсё больш набывае інтэрсуб'ектыўны характар, непасрэдна звязаны з сацыяльнай і культурнай арыентацыяй суб'екта. Іншымі словамі, жывучасць, запатрабаванасць традыцыйных норм і ўяўленняў, што скλаліся цягам доўгага гістарычнага часу, шмат у чым залежыць ад сённяшніх актуалій, тых сацыякультурных змен, якія адбываюцца ў грамадстве, і рэакцыі на іх з боку рэфлексуючага суб'екта. Імі ж абумоўлены і ахоўна-кансерватыўныя тэндэнцыі, звязаныя з тра-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дыцыяй, са сталымі нарматывамі і сістэмамі каштоўнасцей, з жаданнем утрымаць сацыяльную гісторыю ў рамках, асвечаных культурнай традыцыяй. Дарэчы, адкрыта валюнтарысцкія, шмат у чым дэструктыўныя праявы ў адносінах да агульнапрынятага, агульнапрызнанага, сакральнага таксама стымулююць узмацненне кансерватыўна-ахавальных інтэнцый.

Культываванне і адначасова абарона праўдзівых эстэтычных каштоўнасцей ад небяспекі маральнай дэвальвацыі ва ўмовах прагматыкі, дэгуманізацыі, праяў аднапалярнасці мыслення, камерцыялізацыі мастацтва і ўзрастаючай глабалізацыі, – найважнейшая мэта, якая адпавядае стратэгічным задачам дзяржаўнай ідэалогіі. Менавіта гэта думка дамінуе ў працах акадэмічных навукоўцаў-гуманітарыяў – літаратараў, культуролагаў, філосафаў, сацыёлагаў. На сучасным этапе развіцця грамадства яна набывае адмысловы, шмат у чым прыярытэтны статус і важнае дзяржаўна-ідэалагічнае значэнне. Важна пры гэтым не паслабляць, а, наадварот, умацоўваць сувязь пераемнасці, роднасці – гістарычнай, культурнай, міжасобаснай. У кантэксце прымірэнчых пошукаў не варта выключаць магчымасць знаходжання кропак судакранання паміж масавасцю і элітарнасцю, класікай і жывой сучаснасцю і не імкнуцца заганяць іх у рэестр антаганістычнага светапоглядннага канфлікту. Культываванне гарманізуючага пачатку, несумненна, пазітыўна адаб'ецца на ўнутраным самаадчуванні асобы, умацуе яе маральны баланс, актывізуе рэзерваўстойлівасць, духоўную канстантнасць, сталасць. Усё гэта будзе спрыяць умацаванню веры ў стабільнасць жыцця, у запатрабаванасць і дзейснасць патэнцыялу, закладзенага ў чалавеку і накіраванага на тварэнне, на творчасць.

Стабільнасць і запатрабаванасць нацыянальнай традыцыі цесна звязаны з магчымасцю больш усвядомленага і глыбокага ўспрымання як эстэтычнага патэнцыялу літаратурнай класікі, так і сучаснай мастацкай думкі, паколькі многае пазнаецца толькі ў параўнанні. Традыцыя па сваёй сутнасці выступае ў якасці дзейснай і структураўтваральнай дамінанты, генерыруючым і стабілізуючым фактарам літаратурна-мастацкай дзейнасці наогул. Апора на праўду жыцця, захаванне анталагічнага пачатку, арыентацыя на гуманістычныя прынцыпы і ідэалы – нязменныя кампаненты класічнай літаратурнай традыцыі.

Менавіта ў літаратуры – у сілу вядомага літаратурацэнтрызму нацыянальнай культуры, – як у люстэрку, праламляюцца характэрныя асаблівасці нацыянальнай і дзяржаўнай жыццядзейнасці. Адной з галоўных функцый літаратуры становіцца актыўны ўдзел мастацтва слова ў гістарычна абумоўленых працэсах пераўтварэння грамадства. Беларуская літаратура ў лепшых сваіх праявах заўсёды адрознівалася яркай самабытнасцю, цеснай сувяззю з народна-гістарычнымі вытокамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і традыцыямі, з выпрабаванымі на жыццеўстойлівасць маральна-этычнымі асновамі хрысціянскага кодэкса, глыбокім і ўсебаковым разуменнем духоўна-сацыяльнага ідэалу.

Дабіцца чаканага эфекту, як падказвае сусветная мастацкая практыка, магчыма праз пакутлівы пошук ісціны, праз сцвярджэнне гармоніі, прыгажосці і жыццёвага аптымізму. Не варта асацыятыўна суадносіць прыведзеную трыяду з нарматыўнымі, рэгламентаванымі ўказаннямі і загадамі. У дадзеным выпадку гаворка ідзе аб падтрыманні і культываванні базісных, асновасутнасных каштоўнасцей і маральных норм, якія спрыяюць захаванню і развіццю аўтаномнага асобаснага пачатку, суверэннага статусу асобы. Дасягнуць патрэбнага эфекту магчыма пры задзейнічанні, актуалізацыі геннага кода культуры, мастацкіх архетыпаў, міфалагем, канцэптаў, якія спрыяюць асобаснаму духоўнаму самавыяўленню. Пісьменніка можа чакаць поспех там, дзе ён імкнецца абаперціся на традыцыйныя архетыпавыя структуры і каноны, пераасэнсаваць вопыт папярэднікаў, кіруючыся высакароднай мэтай вывесці сучасніка з цянётаў спажывальніцтва і падтрымаць у ім вечную прагу ідэалу. З крызісных сітуацый можна знайсці выйсце, абапіраючыся на цвёрдыя жыццёвыя асновы, не падуладныя відазмяненню ў залежнасці ад выпадковага збегу абставін. І не кіравацца той думкай, што літаратура новага часу ў эксперыментальна-пошукавых, постмадэрнісцкіх манерах пісьма павінна стаць эстэтычным гегемонам і адсунуць «старую» традыцыю, у тым ліку і класічную літаратурную, на другі план. Такія погляды ні ў якім разе не павінны ўспрымацца ўсур'ёз, а тым больш станавіцца метадалагічным крэда і галоўным прынцыпам літаратурнай практыкі. Гісторыя пераконвае: з дапамогай плённай літаратурнай традыцыі заўсёды адкрывалася больш магчымасцей вызначыць галоўны вектар развіцця грамадства і выявіць патэнцыял тых сіл, якія надавалі імпульс яго ўстойліваму і па-сапраўднаму эфектыўнаму гуманістычнаму і сацыяльна-культурнаму абнаўленню.

У наш час запатрабаваны ўзважаны, аб'ектыўны аналіз і падыход да кожнай з'явы мастацтва, устаноўка на раскрыццё актуальных праблем літаратуры ў цеснай сувязі з сучаснасцю. У кірунку ўмацавання дыялагічнай сувязі літаратурнай класікі, традыцыі з актуальнымі сацыяльнымі, духоўнымі, маральнымі праблемамі часу мастацкае слова здольна выявіць свой эстэтычны і гуманістычны патэнцыял, паглыбіць пазнавальна-філасофскі змест і ўзбагаціць сваю мастацка-вобразную палітру ў адлюстраванні жыцця і раскрыцці духоўнага свету свайго сучасніка. Варта памятаць аб тым, што высокамастацкія артэфакты, якія знаходзяць водгук у сэрцах чытачоў, па праве з'яўляюцца важнымі кампанентамі стратэгіі забеспячэння духоўнай нацыянальнай бяспекі, кандэнсатам маральна-этычных, эстэтычных і ідэалагічных каштоўнасцей.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прадстаўнікі творчых прафесій павінны заставацца партнёрамі і аднадумцамі ў светапоглядным дыялогу і супрацоўніцтве паміж рознымі галінамі міжкультурнага дыскурсу, у выпрацоўцы ўзважаных падыходаў і рашэнняў па забеспячэнні стабільнага і ўстойлівага развіцця сацыякультурных сфер грамадства, актыўна ўдзельнічаць у фарміраванні грамадскай свядомасці. Творчая інтэлігенцыя заклікана аб'яднаць свае намаганні па дзейсным уплыве на айчынную сістэму адукацыі, маральнага і грамадзянска-патрыятычнага выхавання, а таксама на сучасныя сродкі масавай інфармацыі як найважнейшы інструмент фарміравання грамадскай свядомасці з мэтай распаўсюджвання высокіх узораў культуры, сацыяльных паводзін, агульначалавечых маральна-этычных норм, якія накладваюцца на гістарычныя традыцыі і хрысціянскія каштоўнасці. Менавіта інтэлігенцыя нясе асобую духоўна-інтэлектуальную адказнасць за цывілізацыйны, культурны і сацыяльны стан нацыі, дзяржавы. Гэтая адказнасць прадугледжвае, па словах А. С. Майхровіча [2], інтэлектуальную творчасць: выпрацоўку ідэалаў і норм ва ўсіх галінах сацыяльнага жыцця, абмалёўку гарызонту будучага, фарміраванне ідэалу – вобраза краіны, дзяржавы, нацыі, чалавека, а таксама больш шырокіх перспектыў глабальнага парадку. Не выклікае сумнення, што літаратарам належыць першынство ў місіі выхаваўчага ўздзеяння на масавую свядомасць: скіроўваць увагу грамадскасці не толькі на паўсядзённыя пытанні сацыяльна-эканамічнага жыцця краіны, але і на глабальныя праблемы гуманітарнага развіцця, а таксама на тое, што дазваляе чалавеку ў сучасным зменлівым свеце заставацца чалавекам, а культуры – захоўваць і актуалізаваць узоры сапраўднай духоўнасці, высокай маральнай чысціні.

Яскравы прыклад таму – беларускія пісьменнікі-адраджэнцы, якія ўзялі на сябе адказную місію быць генератарамі і праваднікамі нацыянальнай ідэі. Палымяным мастацкім словам яны выклікалі ў людзях пачуццё роднасці, духоўнай, чалавечай і нацыянальнай салідарнасці, узаемадапамогі і ўзаемападтрымкі, заклікалі з павагай, беражліва ставіцца да нацыянальных і гістарычных святынь. Класікі нашай літаратуры жылі і тварылі з верай у заўтрашні дзень, у шчаслівую долю народа, маючы на мэце агульнанародны інтарэс, зыходзячы з пазіцыі стваральнага і пазітыўнага дыялогу з жыццём.

Традыцыі класікаў плённа працягваюць і ўзбагачаюць нашы сучасныя пісьменнікі. Сёння пры ўсёй шматмернасці і неадназначнасці працэсаў нівеліравання, стандартызацыі жыцця назіраецца дыялектычнае ўзаемадзеянне традыцый і творчасці, традыцый і інавацый. Пры ўсёй відазмененасці падыходаў да рэалізацыі эстэтычнага ідэалу незаменным застаецца гуманістычны пафас нашай нацыянальнай літаратуры, адстойваецца права на самастойны творчы пошук. У высокамастацкіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

творах сучаснай літаратуры арганічна прысутнічае жаданне прытрымлівацца сталых духоўных канстант, выпрацаваных шматвяковай гісторыяй народа, замацаваных традыцыяй жыццёвых прынцыпаў і сацыяльных норм. Іх мастацкі патэнцыял скіраваны на кансалідацыю сучаснага беларускага грамадства, актывізацыю нацыянальна-культурных і духоўных працэсаў, на захаванне гісторыка-культурнай спадчыны і развіццё нацыянальных традыцый. Яны самым актыўным чынам далучаны да фарміравання грамадзянска-патрыятычнай свядомасці, цэласнага, гарманічнага светабачання, светапогляду. Няма сумнення ў тым, што грамадскія ідэалы павінны грунтавацца на абсалютных, вечных прынцыпах, на культываванні пачуцця гонару і годнасці за слаўнае мінулае сваёй краіны.

Сённяшні час пераконвае ў тым, што літаратура, і мастацкая традыцыя ў тым ліку, ва ўмовах пераходнага перыяду, трансфармацыі і ўзнаўлення ранейшых форм сацыяльнай камунікацыі заклікаы супрацьстаяць каштоўнаснаму рэлятывізму, распаўсюджванню бездухоўнасці, навязванню дэструктыўных стэрэатыпаў паводзін і абясцэньванню сапраўднай сутнасці быцця. Вось чаму на першы план выходзіць пытанне захавання і развіцця духоўна-маральнага патэнцыялу чалавека як аднаго з асноўных фактараў грамадскага развіцця. Творы мастацтва заклікаы культываваць пачуццё гонару за сваю краіну, свой народ, прышчапляць жыццесцвярджальныя нормы і прынцыпы – павагу да чалавека, роднай зямлі, выхоўваць беражлівае, у высокай ступені грамадзянскае стаўленне да сваёй гісторыі і нацыянальных святынь. Важным і неабходным уяўляецца раскрыццё самой прыгажосці, эстэтыкі мастацкага слова, формы і зместу твора мастацтва, яго праблемнай, ідэйнай сутнасці, ступені і глыбіні выяўлення «дыялектыкі душы». Вось чаму гуманітарны кампанент цалкам заслужана і апраўдана ўваходзіць у шырокі спектр міжасобаснай і сацыякультурнай камунікацыі і выступае найбольш дзейсным стратэгічным звяном у наладжванні дыялагічнай сувязі нацыянальнай мастацкай традыцыі і сучаснасці.

*1. Владыковская, Л. Н.* Национальная культура как основа формирования личности: от кризиса к полноценному развитию в современном мире / Л. Н. Владыковская // Духовно-нравственные ценности в формировании современного человека / О. А. Павловская [и др.] ; под ред. О. А. Павловской ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т философии. – Минск, 2011. – С. 178–202.

*2. Майхрович, А. С.* Идеология: сущность, назначение, возможности / А. С. Майхрович. – Минск : Право и экономика, 2004. – 48 с.

*3. Никитин, В. А.* Национальная традиция в поэтическом стиле / В. А. Никитин // Многообразие стилей советской литературы. Проблемы типологии. – М., 1978. – С. 257–279.

*4. Павловская О. А.* Духовно-нравственные основы национальной безопасности Республики Беларусь / О. А. Павловская // Духовно-нравственные цен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ности в формировании современного человека / О. А. Павловская [и др.] ; под ред. О. А. Павловской ; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т философии. – Минск, 2011. – С. 3–37.
5. *Шамякіна, Т. І.* Беларуская класічная літаратура і міфалогія / Т. І. Шамякіна. – Мінск : БДУ, 2001. – 186 с.

*V. Maksimovich*

**National artistic tradition as the basis of preservation of a humanitarian security of a society**

*The role of a national artistic tradition in cultural and philosophical aspects is comprehended. The ontological essence of the tradition as a basis for national archetype is revealed. The connection of traditional culture with a humanitarian security of a society is considered. The impact of aesthetic, ethic and moral values of the Belarusian ethnic culture on the formation of social and cultural norms of the society is underlined.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 21.06.2019.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ